# КУРДСКАЯ ЖАНЧЫНА І РЭВАЛЮЦЫЯ Ў САВЕЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

**А.А. Пабеданосцава-Кая**

Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт
*Універсітэтская наб. 11, 199034, Санкт-Пецярбург, Расійская Федэрацыя,*
*a.pobedonostseva@spbu.ru*

Роля жанчын у курдскіх рэвалюцыйных рухах Сірыі і Турцыі прыцягнула да сябе значную ўвагу ў апошнія гады. Актыўны ўдзел курдскіх жанчын у барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне мае свае вытокі ў ранняй савецкай гісторыі. Савецкае грамадства выбудоўвалася ў працэсе культурнай рэвалюцыі, мэтай якой было пераўтварэнне самога мыслення і культурных рамак праз сацыяльнае вызваленне масаў і нацыянальную эмансіпацыю народаў шматэтнічнай колішняй Расійскай Імперыі ў адпаведнасці з марксісцкай ідэалогіяй. У кантэксце культурнай рэвалюцыі і пабудовы сацыялізму жанчыны разглядаліся як рухаючая сіла першараднага значэння. У адсутнасць шматлікага класа пралетарыяту ў мусульманскіх грамадствах СССР, яны станавіліся «сурагатным пралетарыятам» і гэтае пераасэнсаванне ролі жанчын у грамадстве патрабавала адпаведных захадаў у галіне масавай культуры і асветы.

***Ключавыя словы*:** курды; Курдыстан; Турцыя; Арменія; СССР; культурная рэвалюцыя; нацыянальнае будаўніцтва; жаночае пытанне.

# THE KURDISH WOMAN AND THE REVOLUTION IN SOVIET CULTURE

**A. O. Pobedonostseva-Kaya**

*Saint-Petersburg State University*
*Universitetskaya embankment 11, 199034, Saint-Petersburg, Russian Federation,*
*a.pobedonostseva@spbu.ru*

The role of women in the Kurdish revolutionary movements of Syria and Turkey has attracted considerable attention in recent years. This phenomenon of women actively fighting for the social and national liberation of Kurdish society has parallels in early Soviet history. Soviet society was built in the process of the cultural revolution, the purpose of which was to transform the very thinking and cultural framework in the direction of social liberation of the oppressed masses and national emancipation of ethnic groups of the multinational former Russian Empire. In the context of the Cultural Revolution and the construction of socialism, women were seen as a driving force of paramount importance. In the absence of a large proletarian class in the Muslim societies of the USSR, they became a “surrogate proletariat” and this rethinking of the role of women in society required appropriate measures in the field of mass culture and education.

***Key words*:** Kurds; Kurdistan; Turkey; Armenia; USSR; cultural revolution; nation-building; women issue.

“*У адрозненне ад запалоханай і схаванай ад чужых вачэй турчанкі, курдская жанчына не схільная да самотніцтва і гэта значна палягчае працу сярод курдзянак і ўцягванне іх у савецкае будаўніцтва*”.

Араб Шамілаў,
курдскі пісьменнік [1, с. 88–89].

Паняцце культурная рэвалюцыя ўключала ў сябе шэраг захадаў, якія павінны былі пераўтварыць мысленне адпаведна ідэалогіі новага, савецкага грамадства. Асноўнымі кірункамі культурнай рэвалюцыі сталі ў прыватнасці ліквідацыя непісьменнасці, стварэнне работніцка-сялянскай інтэлігенцыі, стварэнне культурніцкіх прадуктаў, прысвечаных рэвалюцыі, сацыялізму і патрыятызму. Усё гэта павінна было забяспечыць мабілізацыю мас, павысіць іх палітычны і культурны ўзроўні і падрыхтаваць неабходныя для краіны з новай ідэалогіяй кадры.

Разам з культурным пытаннем, неабходна было вырашыць нацыянальнае пытанне, бо ў спадчыну ад Расійскай Імперыі бальшавікі атрымалі краіну з мноствам этнічных груп, з якіх планавалася сфармаваць сацыялістычныя народы, паралельна фармуючы “савецкага чалавека”. Згодна абвешчанаму ў 1923 г. афіцыйнаму курсу, савецкая дзяржава мелася падтрымліваць тыя формы нацыянальнага ўладкавання, якія не супярэчаць існаванню ўнітарнай цэнтралізаванай дзяржавы. Гэта азначала, што ўлады былі гатовыя падтрымліваць наступныя чатыры “*формы*” існавання нацый: нацыянальную тэрыторыю, мову, эліты і мадэрную культуру [2, с. 22]. Адным са складнікаў нацыянальнага будаўніцтва ў 1920-х гг. было кшталтаванне новай нацыянальнай ідэнтычнасці шляхам прапаганды рэінтэрпрэтаванай гістарычнай спадчыны гэтых народаў [3, с. 241]. Гэта будавалася на тэзісе І.В. Сталіна аб “*сацыялістычных па змесце, нацыянальных па форме*” нацыянальных культурах [4, с. 9].

Савецкая палітыка нацыянальнай эмансіпацыі ставіла на мэце вырашэнне не толькі нацыянальнага, але і жаночага пытання, бо ў пытаннях “культурнай рэвалюцыі” і пабудовы сацыялізму жанчыны разглядаліся як значны кадравы рэзерв. Разнастайнае водгулле гэтай савецкай палітыкі заўважнае, часам, у нечаканых сітуацыях і рэгіёнах. Прыкладам могуць быць вядомыя кадры з Сірыі або Ірака, што паказваюць мноства дзяўчат са зброяй[1]. Але калі ў курдскіх арганізацыях у Сірыі, асаблівую ролю пачынаюць адводзіць жанчынам, то гэтая з’ява стала вынікам даўніх

[1] Гл, напрыклад, фільм “Дочкі сонца” (2018).

сацыяльных працэсаў. Цягам доўгага часу была сфармаваная культура ці прынамсі традыцыя ўдзелу курдскай жанчыны ў рэвалюцыйных рухах, хаця ачольвалі іх пераважна мужчыны [5, с. 346].

Аб сацыяльным абліччы і побыце курдаў да 1917 г. існуе процьма сведчанняў самых розных аўтараў, у т.л. курдскіх. Многія з іх характарызавалі курдзянак як найбольш разняволеных параўнальна з жанчынамі суседніх народнасцяў. У першую чаргу вандроўцы адзначалі, што "*жанчын курдскіх трымаюць не так строга, як турэцкіх і арабскіх*" [6, с. 142]. Курдскія жанчыны маглі займацца гандлем, прысутнічаць на сходах і прымаць гасцей [7, с. 15]. Курдзянкі ў Асманскай імперыі "*чадры не насілі, адрозніваліся смеласцю, добра ведалі свае абавязкі, самі разбівалі намётавы лагер, самі выбіралі сабе мужоў або ўцякалі з племя з сваімі абраннікамі не атрымаўшы дазволу на шлюб, былі занятыя ва ўсіх сферах жыцця племя*" [8, p. 187].

Да 1917 г. у курдскай жанчыны было асаблівае становішча: у качэўнікаў жанчына заўжды карысталася большай свабодай, чым сярод аселага насельніцтва, бо ва ўмовах развіцця высакагорных формаў жывёлагадоўлі жаночая праца была запатрабаванай пры гадоўлі дробнай рагатай жывёлы. Іншай прычынай павелічэння ролі жанчын стала тое, што горным пастуховым плямёнам часцей даводзілася бараніцца ад нападаў і ўсё дарослае насельніцтва племя, уключаючы жанчын, тады складала апалчэнне [9, с. 40].

Гісторыі вядомыя выпадкі ваяўнічых курдскіх жанчын, якія добра валодалі зброяй і ездзілі конна [10, с. 119]. Гэтую традыцыю ваяўнічасці звязваюць між іншым з двума курдзянкамі, якія ўвайшлі ў гісторыю пад імем Кара Фатма. Першая камандавала курдскім падраздзяленнем у Крымскай вайне (1853-56 гг.) [11, с. 56-57], або ў руска-турэцкай вайне 1877-1878 гг. [12, с. 67] [13, p. 95-112]. Другая Кара Фатма брала ўдзел у вайне туркаў за незалежнасць (1919-1923 гг.) – яна сабрала і ўзначаліла атрад курдаў, была колькі разоў параненая [14, с. 259]. З цягам часу яе атрад увайшоў у склад турэцкай арміі [15, с. 39-40].

Кара Фатма, прыклад якой вядомы курдзянкам [16, с. 4], была не адзіным выпадкам, але нельга змешваць па-сутнасці дамадэрныя грамадствы без масавай палітызацыі і перабольшваць маштабы. Доўгі час пасля абвяшчэння Турэцкай Рэспублікі чакалася, што яна рушыць ў бок СССР і сацыялізму, рух Атацюрка лічыўся прагрэсіўным, а Кара Фатма ўвасабляла народна-вызваленчы рух.

Але вобразы сённяшніх ваярак ў атрадах найперш Рабочай партыі Курдыстана мацней звязаныя з традыцыяй левай, сацыялістычнай або камуністычнай палітыкі. Вытокі масавага ўцягвання жанчыны ў барацьбу

гэта ў першую чаргу савецкі досвед, пазней развіты кітайскімі камуністамі, але пачаткі ўсяго гэтага – ў 1920-1930 гг. у СССР.

Паняцце культурная рэвалюцыя ўключала ў сябе захады, скіраваныя на пераўтварэнне самога мыслення згодна ідэалогіі новага, савецкага грамадства. Асноўнымі напрамкамі культурнай рэвалюцыі сталі ліквідацыя непісьменнасці насельніцтва, стварэнне інтэлігенцыі з сялян і рабочых, выпуск культурных прадуктаў, прысвечаных рэвалюцыі, сацыялістычнаму ладу і патрыятызму. Усё гэта мусіла мабілізоўваць масы, павышаць іх палітычны ды культурны ўзроўні і рыхтаваць кадры, неабходныя краіне з новай ідэалогіяй.

Разглядаючы працэс мадэрнізацыі, Г. Масэл адзначае, што найбольш драматычна праходзіла спроба мадэрнізацыі Цэнтральнай Азіі, у т.л. таму што гэтая мадэрнізацыя зыходзіла не ад мясцовай эліты ці контрэліты, а ад вонкавых сілаў, што адрозніваліся радыкальным бачаннем, выразнай ідэалогіяй і рэвалюцыйным імпэтам [17, с. xxi]. У выніку, савецкія ўлады ў гэтым рэгіёне рабілі стаўку на падрыў традыцыйнага сацыяльнага ладу праз мабілізацыю жанчын.

Гэты падыход падкрэсліваў, што ў традыцыйных мусульманскіх грамадствах жанчыны маглі лічыцца “*найніжэйшымі з ніжэйшых*”, г.зн. эксплуатаванымі, прыніжанымі і прыгнечанымі. Такім чынам, мусульманскія жанчыны сталі прадстаўляць у савецкім палітычным уяўленні структурна слабое месца ў традыцыйным сацыяльным ладзе: патэнцыйна дэвіянтны, а таму падрыўны пласт, успрымальны да ваяўнічага закліку – г.зв. “сурагатны пралетарыят” [17, с. xxi-xxii]. Анягож пралетарыяту ў марксісцкім разуменні яго як прамысловых работнікаў механізаваных заводаў) у тамтэйшых грамадствах не было. Гэта датычыць і курдаў. Асноўная частка курдскага насельніцтва пражывала тады ў найменш мадэрнізаваных раёнах Блізкага Ўсхода – у сучасных Турцыі, Іраку, Іране і Сірыі. У тагачасным СССР курдскае насельніцтва таксама жыло пераважна ў найменш развітых у сацыяльна-эканамічным дачыненні раёнах Азербайджана, Арменіі ды Туркменістана.

Пралетарыят лічыўся кіруючай сілай, якая пацягне за сабой астатніх у рэвалюцыйным працэсе, а поспехі ў пошуку альтэрнатыў у паўднёвых і ўсходніх раёнах СССР мелі вырашальнае значэнне для савецкага будаўніцтва. Пры гэтым, канцэпцыя Масэла болей стасуецца курдзянак, чым жанчын іншых народаў рэгіёна, бо яны былі болей падрыхтаваныя да гэтага гістарычна. Адпаведны праект “разняволення жанчыны Ўсходу” актыўна ажыццяўляўся ў перыяд да 1930 гг., бо пазней лічылася, што гендэрная і нацыянальная роўнасць у краіне дасягнутая [18, с. 182].

Адным з магутных інструментаў пашырэння новых ідэй і практык была візуальная прапаганда: кінематограф, перыядычны друк, плакаты

дый іншыя аб'екты савецкай матэрыяльнай культуры з іх яркімі візуальнымі вобразамі і друкаванымі заклікамі агітавалі савецкіх грамадзян змагацца за новае жыццё. І як прадстаўніцы нацыянальных меншасцяў, і як жанчыны Ўсходу курдзянкі былі ўцягнутыя ў глабальны праект стварэння “новага чалавека”. Часткай культурнага канону станавіўся і спорт, і фізкультура [19], і пачатковая вайсковая падрыхтоўка, якая ўваходзіла ў абавязковую праграму, якую асвойвалі жанчыны па ўсім Саюзе. Палітычна актыўныя курдзянкі не толькі забяспечвалі максімальную яўку на выбарах [20, с. 32], але і вылучаліся кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Армянскай ССР [21].

Безумоўна, савецкія практыкі прыцягнення жанчын да грамадскай і палітычнай дзейнасці ў выпадку курдаў былі толькі прыватным прыкладам застасавання стандартызаванай савецкай палітыкі. Але савецкія падыходы і метады аказалі на пэўныя этнічныя групы ўнутры СССР і іх супляменнікаў за яго межамі больш ўплыву, чым на іншыя, асабліва гэта датычыцца курдаў. Трансфер адпаведных ідэяй і практык адбываўся праз курдскіх актывістаў, якія мелі дачыненне да савецкай курдскай палітыкі міжваеннага перыяду і пасля адыгралі прыкметную ролю ў арганізацыі курдскага палітычнага руху на Блізкім Усходзе [22–23].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Шамилов А.* Курды Закавказья // Революция и культура. 1930. № 15–16. С. 86–87.

2. *Мартин Т.* Империя «положительной деятельности». Нации и национализм в СССР, 1923-1939. Москва: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2011.

3. *Тольц В.* “Собственный Восток России”. Политика идентичности и востоковедение в позднеимперский и раннесоветский период. М.: Новое литературное обозрение, 2013.

4. *Сталин И.В.* О национальном вопросе и национальной культуре // Культура и письменность Востока. 1931. Кн. 7–8. С. 5–13.

5. *Джансыз С.* Сара: вся моя жизнь была борьбой. М.: Радикальная теория и практика, 2020.

6. *Эйрие Ж.Б.* Живописное путешествие по Азии. Т.6. М.: Типография Н. Степанова, 1840.

7. *Баязиди М.* Нравы и обычаи курдов. М. : Издательство восточной литературы, 1963.

8. *Lewis R.* Everyday life in Ottoman Turkey. London: B.T. Batsford Ltd.; New York: G.P. Putnam's Sons, 1971.

9. *Вильчевский О.Л.* Курды: введение в этническую историю курдского народа. М.; Л.: Издательство АН СССР, 1961.

10. *Пчелина Е.* По Курдистанскому уезду Азербайджана // Советская этнография. 1932. № 4. С.108–121.

11. *Елисеев А.* Положение женщины на Востоке // Северный вестник. 1888. № 8. С.49–88.

12. Материалы для описания русско-турецкой войны 1877-1878 г.г. на Кавказско-Малоазиатском театре с планами. Сост. Подполковник Томкеев. Т. 2. – Санкт-Петербург, 1904.

13. Bruinessen, M. van. From Adela Khanun to Leyla Zana: Women as Political Leaders in Kurdish History / M. van Bruinessen // Women of a Non-State Nation: The Kurds. Ed. by Sh. Mojab. – California: Mazda Publishers, 2001. – 295 p.

14. С-кий, К. Гази Мустафа Кемаль-паша / К. С-кий // Военная мысль и революция. – 1923. – № 2. – С. 253–262.

15. Лансере, Е. Лето в Ангоре. Рисунки и заметки из дневника поездки в Анатолию летом 1922 г. / Е. Лансере . – Ленинград: Брокгауз-Ефрон, 1925. – 86 с.

16. Сафарова, Л. Езидские женщины / Е. Сафарова // Nêrîna Nû (Новый взгляд). – 2011. – № 1. – С. 4.

17. Massell, G. J. The Surrogate Proletariat. Moslem Women and Revolutionary Strategies in Soviet Central Asia, 1919–1929 / G. J. Massell. – Center for International Studies, Princeton University, 2015. – 492 p.

18. Щурко, Т. «Женщина Востока»: советский гендерный порядок в Центральной Азии между колонизацией и эмансипацией / Т. Щурко // Понятия о советском в Центральной Азии: Альманах Штаба № 2: Центральноазиатское художественно-теоретическое издание. – Бишкек: Штаб-Press, 2016. – С. 178–209.

19. Hoffmann, D. L. Cultivating the Masses. Modern State Practices and Soviet Socialism, 1914-1939 / D. L. Hoffmann. – Cornell University Press, 2011. – 327 p.

20. Выборы в советы и состав органов власти в СССР в 1929. Москва: Издательство «Власть Советов» при Президиуме ВЦИК, 1929. – 105 с.

21. Советская Сибирь. – 1938. – № 105 (5537).

22. Talabani J. Mudhakirāt al-rayis Jalāl Tālabāni: rihlatu sittūn ʿaman min jibali Kurdistan ila qasri al-Salām / J. Talabani. – al-Dār al-ʿarabiyyat li-l-ʿulūm nāširūn, 2018.

23. Победоносцева-Кая А. О. “Мукринские курды” О.Л. Вильчевского: что и почему было удалено перед публикацией? / А. О. Победоносцева-Кая // Ислам в современном мире. – 2020. – Т.16. – № 4. С. 99–116.